Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 67–70

УДК 796.011

# СПАРТЫЎНЫЯ ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ: СТВАРЭННЕ, СТРУКТУРА, ДЗЕЙНАСЦЬ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

**С. І. Бусько,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі БДУФК*

Паступіў у рэдакцыю 14.04.20

UDC 796.011

# SPORTS STATE ORGANIZATIONS IN BELARUSIAN PROVINCES: CREATION, STRUCTURE, ACTIVITY (THE END OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY)

**S. Busko,**
*PhD in History, Associate Pofessor of the Department of Philosophy and History, BSUPC*

Received on 14.04.20

Артыкул прысвечаны фарміраванню спартыўных грамадскіх арганізацый у беларускіх губернях у канцы XIX ст. Аўтар разглядае асаблівасці такіх паняццяў, як таварыства і грамадская арганізацыя ў прававой сістэме Расійскай імперыі. Вылучаны асноўныя механізмы рэгістрацыі спартыўных таварыстваў, патрабаванні да тыпавых статутаў арганізацый. Нададзена ўвага спецыфічным рысам узнікнення і дзейнасці спартыўных таварыстваў у беларускіх губернях. Прааналізавана структура спартыўных арганізацый, іх асноўныя тыпы і крыніцы фінансавання. Аўтар робіць выснову, што на першым этапе сваёй дзейнасці ў 1890–1907 гг. спартыўныя арганізацыі былі недасягальныя для большай часткі грамадства. Падлічана, што ў 1914 г. у беларускіх губернях дзейнічала больш за 40 спартыўных грамадскіх арганізацый.

*Ключавыя словы:* спартыўнае таварыства, фізічная культура, спорт, статут, яхт-клуб, грамадская арганізацыя, Беларусь, структура.

The article is devoted to forming the sports state organizations in Belarusian provinces in the end of the XIX century. The author considers the features of such notions as association and state organization in the legal system of the Russian Empire. The main mechanisms of registration of sports associations and the requirements to the typical statutes of organizations are defined. The attention is paid to the specific features of appearance and activity of sports associations in Belarusian provinces. The structure of sports organizations, their main types and sources of financing are analyzed. The author concludes that on the first stage of its existence in 1890-1907 sports organizations were unavailable for the majority of society. It is counted that in 1914 more than 40 sports state organizations were working in Belarusian provinces.

*Keywords:* sports association, physical culture, sports, statute, yacht-club, state organization, Belarus, structure.

*Уводзіны.* Фізічная культура і спорт набываюць усё большае значэнне ў сучасным грамадстве. Навыкі і веды, якія атрымліваюць пры актыўнай фізічнай дзейнасці, напрамую ўплываюць на дабрабыт насельніцтва, паляпшаюць фізічны і псіхалагічны стан чалавека. Ва ўсёй савецкай і часткова сучаснай беларускай гістарыяграфіі станаўленне фізічнай культуры, спорту разглядалася з моманту ўзнікнення савецкай дзяржавы. Толькі ў апошнія некалькі гадоў з’яўляюцца даследаванні, прысвечаныя дарэвалюцыйнаму спорту і культуры правядзення вольнага часу ў Расійскай імперыі. Рост колькасці аматарскіх спартыўных таварыстваў у Расіі ў канцы XIX ст. быў заканамерным вынікам мадэрнізацыі краіны і адлюстроўваў сацыяльныя і эканамічныя змены. Вывучэнне спартыўных арганізацый, асаблівасцей іх узнікнення, структуры і дзейнасці дазволіць з новага ракурсу паглядзець на трансфармацыю беларускага грамадства на рубяжы стагоддзяў у параўнанні з агульнаеўрапейскімі поспехамі ў гэтай сферы. Даследаванне дае магчымасць па-новаму звярнуць увагу на гісторыю сучаснага беларускага спорту, вярнуўшы ў навуковы зварот страчаныя традыцыі і гісторыю шматлікіх відаў спорту.

*Асноўная частка.* Неабходнай умовай для вывучэння грамадскіх арганізацый як сацыяльнага інстытута з’яўляецца вызначэнне зместу гэтага тэрміна. У разглядаемы час у беларускіх губернях як частцы Расійскай імперыі ўжываліся такія тэрміны як «таварыствы», «асацыяцыі», «прыватныя суполкі», «таварыствы прыватнай ініцыятывы». Сам тэрмін «грамадскі» разумеўся на мяжы XIX–XX стст. як недзяржаўны, а грамадскімі арганізацыямі (акрамя ўласна добраахвотных таварыстваў у сферы навукі, здароўя, добраўпарадкавання, сацыяльнай дапамогі) лічыліся ў тым ліку і органы мясцовага самакіравання [1, с. 9]. Такая блытаніна і адсутнасць класіфікацыі стала яшчэ больш актуальнай у пачатку XX ст. па меры ўзрастання грамадскага руху. У 1904 г. у МУС былі агучаны прапановы па выдзяленні ў асобныя групы публічна-прававых (мясцовае самакіраванне) і прыватна-прававых арганізацый.

Вызначэнне тэрміна «таварыства» было акрэслена ў Часовых правілах аб таварыствах і саюзах 4 сакавіка 1906 г. Пад таварыствам у заканадаўстве разумелася «аб’яднанне некалькіх асоб, якія, не маючы цікавасці ў атрыманні для сябе прыбытку ад якога-небудзь прадпрыемства, абралі прадметам сваёй дзейнасці пэўную мэту» [1, с. 12].

З’яўленне недзяржаўных грамадскіх арганізацый у палітычнай сістэме Расійскай імперыі адбывалася супярэчліва. Спрыяючы пашырэнню сярод насельніцтва нехарактэрных для яго каштоўнасцей дэмакратычнай прававой культуры і грамадзянскай адказнасці, грамадскія арганізацыі знішчалі аўтарытарныя падмуркі самаўладдзя, адначасова дапамагаючы яму адаптавацца пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі [2]. Дзяржаўная ўлада імкнулася аказаць падтрымку пачынанням грамадскай супольнасці, што спрыялі задавальненню асобных матэрыяльных ці культурных патрэб насельніцтва, але адначасова стварала перашкоды з-за магчымага развіцця апазіцыйнага руху ўнутры гэтых суполак. Гэта яскрава прасочваецца ў беларускіх губернях на прыкладзе нацыянальных спартыўных таварыстваў.

У пачатку XIX ст. для адкрыцця і рэгістрацыі таварыства патрабавалася іх зацвярджэнне імператарам, але ў 1860-я гг. зацвярджаць уставы сталі асобныя міністры. З 1892 г. гэта норма была ўключана ў функ-

цыянальныя абавязкі міністэрстваў і іх структурных падраздзяленняў [3, с. 8, 9]. Роля цэнтра, які выпрацоўваў агульны кірунак палітыкі дзяржаўных устаноў, была з 1881 г. аддадзена Дэпартаменту паліцыі МУС, без санкцыі якога рэгістрацыя не праводзілася. Так, статут Віцебскага таварыства раварыстаў быў зацверджаны намеснікам шэфа жандараў генерал-лейтэнантам Панцялеевым 12 кастрычніка 1899 г. [4, с. 1].

Важную ролю ў рэгістрацыі і дзейнасці таварстваў адыгрывалі ўстаноўчыя дакументы – статуты. З 1890-х гг. пашыраецца практыка распрацоўкі «нормальнага устава». Мэта стандартызацыі статута была простай і эфектыўнай (з пазіцыі дзяржаўных органаў). Гэта дазваляла ўпарадкаваць справаводства і лепш адсочваць спрэчныя фармуліроўкі статутаў. За 5–7 гадоў практыкі былі выпрацаваны «нормальные уставы» амаль для ўсіх сфер грамадскага жыцця: сельскагаспадарчыя, пажарныя, дабрачынныя, і, у тым ліку, спартыўныя статуты. Менавіта таму абсалютная большасць статутаў у сваёй сферы не адрозніваюцца, напрыклад, статут Віцебскага таварыства раварыстаў-аматараў (1899 г.) не адрозніваецца ад Віленскага (1892 г.), Дзвінскага (1894 г.) і Гродзенскага (1898 г.) [4].

У канцы XIX ст., па меры накаплення ў адпаведных міністэрствах тыпавых узораў розных статутаў, была зроблена спроба далейшага ўладкавання працэдуры стварэння грамадскіх арганізацый. Статуты, што не адпавядалі тыпавым варыянтам, як і раней, накіроўваліся на разгляд у профільнае міністэрства. Таварыствы, што спрабавалі прайсці рэгістрацыю на падставе тыпавога статута, сталі зацвярджацца мясцовай адміністрацыяй – генерал-губернатарам ці губернатарам. Аднак спецыфіка дзяржаўнай палітыкі ў беларускіх губернях вымушала мясцовую адміністрацыю негатыўна адносіцца да спробы стварэння любой грамадскай арганізацыі як формы магчымай антыўрадавай дзейнасці.

У снежні 1893 г. група гродзенскіх чыноўнікаў (у тым ліку кіраўнік губернскай казённай палаты, паліцмейстар, кіраўнік губернскай канцэлярыі, саветнік губернскага праўлення, член губернскай па вайсковых справах прысутнасці, старшы ўрач Гродзенскай акруговай лячэбніцы, камандзіры 102-га Вяцкага і 103-га Петразаводскага палкоў, афіцэры жандарскага ўпраўлення) падалі заяву ў канцылярыю Віленскага генерал-губернатара аб адкрыцці таварыства раварыстаў-аматараў. У тэксце было пазначана, што «язда на ровары страціла цяпер характар гігіенічнай забавы і ператварылася ў зручны па сваёй шпаркасці і таннасці спосаб перамяшчэння. У Гродзенскай губерні ў апошні час таксама стаў развівацца гэты карысны спорт, і ўжо ёсць нямала асоб, якія вывучылі ровар, а яшчэ больш жадаючых карыстацца роварамі. Аднак развіццё гэтай справы абцяжарваецца наступнымі ўмовамі: няма агульнадаступнага ровара, на якім бы можна было пад кіраўніцтвам дасведчанай асобы навучацца яздзе; усялякі пачатковец пры набыцці ровара і папраўцы яго часта затрачвае значную суму на рэч цалкам непрыдатную» [5, с. 82].

Галоўную мэту таварыства ініцыятары сфармулявалі ў зближэнні аматараў язды на ровары, яе ўдасканаленні і распаўсюджванні як прыемнага, практычна карыснага для здароўя спосабу руху. Для дасягнення гэтай мэты таварыства мела намер праводзіць сходы, экскурсіі і спаборніцтвы, а для павелічэння сродкаў «уладкоўваліся вечары, канцэрты і іншыя забавы» [5, с. 84]. Арганізатары зрабілі ўсе неабходнае (па нефармальных нормах канца XIX ст.): запрасілі ў лік заснавальнікаў вядомых асоб, здабылі подпісы высокіх чыноўнікаў. Аднак віленскі генерал-губернатар статут не зацвердзіў. Магчыма, што гэта звязана са зменай генерал-губернатара у пачатку 1893 г. У адрозненне ад свайго папярэдніка І. С. Каханава (які ў 1892 г. дазволіў таварыства аматараў ровара ў Вільні), генерал П. В. Аржэўскі выказаўся адмоўна. Цікава, што наступную спробу рэгістрацыі гарадзенскія аматары зрабілі адразу пасля прызначэння новага генерал-губернатара В. М. Троцкага ў 1898 г. і яна стала паспяховай.

І наадварот, добрыя ўзаемаадносіны губернскіх улад і мінскага гарадскога галавы графа Я. К. Чапскага дазволілі яму дастаткова хутка зарэгістраваць у той жа час (1892 г.) Мінскае таварыства аматараў спорта па тыпавым статуце [6, с. 187]. У адрозненне ад Масквы ці Санкт-Пецярбурга ля вытокаў спартыўных арганізацый у беларускіх губернях адсутнічалі замежныя грамадзяне, гэта заканамерны вынік больш позняга часу іх узнікнення. Правадніком новых ідэй сталі чыноўнікі, ваенныя, студэнты (пры гэтым асобнага студэнцкага спорту ў беларускіх губернях не існавала з-за адсутнасці ВНУ).

Павелічэнне колькасці запытаў на рэгістрацыю, іх неаднароднасць нават пры спасылцы на тыпавыя статуты вымусілі міністра ўнутраных спраў І. Л. Гарамыкіна зацвердзіць 29 красавіка 1897 г. правілы прадстаўлення статутаў на подпіс у адпаведныя міністэрствы. Былі пазначаны асноўныя параметры статута: камплектаванне, крыніцы прыбытку, правядзенне агульных сходаў і г. д. Зацверджаныя 15 чэрвеня 1898 г. дапаўненні ўводзілі абмежаванні на асабовы склад таварыстваў [7, с. 61]. Забараняўся удзел у грамадскіх арганізацыях ніжэйшым вайсковым чынам, навучэнцам вайсковых і духоўных устаноў. Аднак навучэнцы астатніх устаноў адукацыі, а таксама непаўналетнія былі дапушчаны да членства ў арганізацыях спартыўнага характару, як і ў таварыствах фізічнага развіцця і ўдасканалення ў мастацтве, але былі пазбаўлены права ўдзельнічаць у агульным галасаванні і выбірацца ў кіруючыя органы.

Рост папулярнасці спорту і фізічнага выхавання ў пачатку XX ст. прывёў да выдзялення яго ў асобны пункт амаль ва ўсіх заканадаўчых дакументах. Так, у новай рэдакцыі І часткі X тома ПСЗ Расійскай імперыі адным з магчымых напрамкаў грамадскай дзейнасці «обществ» у арт. 924 было пазначана развіццё фізічных сіл і спрыту (спорту). Праз пяць гадоў у сакавіку 1904 г. асобая нарада пры МУС распрацавала парадак зацвярджэння статутаў. Так, статуты яхт-клубаў, спартыўных і шахматных клубаў, таварыстваў садзейнічанню маральнаму і фізічнаму развіццю зацвярджаў Дэпартамент агульных спраў, але перад тым іх правяралі ў Дэпартаменце паліцыі [1, с. 68]. Значным момантам у дарэвалюцыйных зменах заканадаўства сталі Часовыя правілы аб саюзах і таварыствах ад 4 сакавіка 1906 г. Прапаноўвалася два варыянты: явачны (безстатутныя аб'яднанні, што не мелі правоў юрыдычнай асобы) і рэгістрацыя на падставе статута. Усе спартыўныя таварыствы і арганізацыі па садзейнічанні фізічнаму развіццю ў беларускіх губернях абіралі другі варыянт [8, арк. 12].

У лютым 1916 г. па неакупаваных паветах беларускіх губерняў былі разасланы цыркуляры губернатараў аб пастанове Савета міністраў ад 18 лістапада 1915 г. аб увядзенні новага парадку зацвярджэння таварыстваў па фізічным развіцці і спорту. Вярталіся ва ўжытак тыпавыя праекты статутаў.

Цікавасць выклікаюць пункты 5–6, дзе патрабавалася пазначыць колькасць непаўналетніх членаў да 17 год, колькасць ваенных ніжніх чыноў і навучэнцаў і колькасць прафесійных спартсменаў (па правілах адпаведных Усерасійскіх саюзаў) [9, арк. 3].

Спецыфіка спартыўных заняткаў вызначыла ўзнікненне сістэмы знешніх атрыбутаў прыналежнасці да вызначанага клубу (знакі, эмблемы, сцягі, уласныя друкаваныя выданні), што, у сваю чаргу, фарміравала новыя прынцыпы камунікацыі. Спартыўныя грамадскія арганізацыі ў беларускіх губернях не былі выключэннем. Мазырскі яхт-клуб увёў свой варыянт формы – белы кіцель з пяццю жоўтымі гузікамі і выявай якара (летняя версія) і цёмна-блакітны кіцель (зімовая версія). Сцягі Віцебскага рачнога яхт-клуба былі зацверджаны 30 красавіка 1895 г. – сіні крыж на белым полі з гербам віцебскай губерніі ў верхнім левым квадраце (кармавы, сцяг ганаровага члена, камітэта або гоначнай камісіі, брэйд-вымпела ганаровага камандора, камандора (з сіняй палоскай), віцэ-камандора (з чырвонай палоскай). Дарэчы, асобныя яхты з іншых гарадоў Падзвіння мелі магчымасць запісвацца ў члены віцебскага яхт-клуба і па заяве на імя камандора выкарыстоўваць сцяг і атрымліваць адпаведныя бонусы ў Рызе ці Санкт-Пецярбургу. Так, полацкія кадэты на яхце «Канстанцін» атрымалі права як члены Віцескага яхт-клуба бясплатна карыстацца гаванню рыжскага яхт-клуба [10, с. 14].

Сімволіка таварystваў таксама зацвярджалася, так, 17 красавіка 1900 г. гродзенскі губернатар М. А. Дабравольскі дазволіў значок для мясцовых аматараў ровара – значок меў форму круга і быў бірузовага колеру, па акружнасці яго меўся надпіс «Гродненское общество велосипедистов», унізе знаходзілася дата – 1899 г., а ў цэнтры – пакрыты чырвонай эмаллю шчыт, у сярэдзіне якога размяшчаўся зубр залацістага колеру (герб губерніі) [5, с. 83].

У працэсе з'яўлення і развіцця спартыўных арганізацый у беларускіх губернях Расійскай імперыі выразна вылучаюцца два перыяды: 1892–1907 гг. і 1907–1914 гг. Першы перыяд характарызуецца наяўнасцю абмежаванага ліку спартыўных таварystваў, пераважна арыстакратычнага, закрытага саслоўнага характару. Да іх ставіліся, галоўным чынам, клубы паруснага спорту (напрыклад, Віцебскі рачны яхт-клуб (1895 г.), таварystвы аматараў-раварыстаў (Вільня – 1892 г., Дзвінск – 1894 г.), таварystвы аматараў правільнага палявання (Віцебск – 1898 г.).

У час першай расійскай рэвалюцыі пачынае хутка расці лік спартыўных клубаў буржуазнага тыпу, сяброўства ў якіх вызначалася не толькі саслоўнай прыналежнасцю, але і заможнасцю кандыдатаў. Адначасова з гэтым расце колькасць гурткоў аматараў малавыдатковых, а таму больш даступных для шырокіх гарадскіх слаёў такіх відаў спорту, як футбол, лёгкая атлетыка, канькабежны спорт. У 1907–1908 гг. ідзе трансфармацыя спартыўных арганізацый пэўнага віду спорта ў шматпрофільныя – у беларускіх губернях адлюстраваннем гэтага працэсу стала ўзнікненне таварystваў па садзейнічанні фізічнаму развіццю. За 1907–1909 гг. такія арганізацыі ўзніклі амаль ва ўсіх губернскіх гарадах: у Гродна яно стала пераемнікам таварystва аматараў ровара (1908), у Брэст-Літоўску (1907), Магілёве (1908), Барысаве (1913) яны выраслі з гурткоў сістэмы адукацыі.

Сяброўства ў таварystве служыла своеасаблівым сродкам дэманстрацыі сацыяльнага статусу. І чым больш недасягальным быў клуб (гэта выяўлялася ў высокіх членскіх узносах і рэкамендацыях для прыняцця ў члены), тым вышэй быў статус асобы. Набываючы заступніцтва каго-небудзь з кіраўніцтва горада ці губерніі, таварystва станавілася яшчэ больш прывабным. Мінскае таварystва аматараў спорту паводле справаздачы за 1898 г. налічвала 134 пастаянных члена, якія плацілі даволі высокія па тых часах гадавыя ўзносы – 6–7 руб. [6, с. 184]. У Віцебскі яхт-клуб прымаліся толькі мужчыны, за выключэннем вучняў, ваенных і раней асуджаных, па рэкамендацыі трох сапраўдных членаў таварystва. Жонкі і дзеці дапускаліся толькі на агульныя забаўляльныя святы. Штогадовы членскі ўзнос складаў 15 руб. [11, с. 281]. У структуры таварystваў такога замкнёнага тыпу таксама прысутнічала градацыя. Члены клуба: члены сапраўдныя, ганаровыя – мелі розны статус і правы. Такім чынам, спартыўнае таварystва прапаноўвала альтэрнатыву сацыяльнай іерархіі і сацыяльнай структуры.

Колькасць членаў у таварystвах вагалася ў залежнасці ад шэрагу фактараў: кошт членства, спад ці ўздым папулярнасці пэўнага віда спорту, бонусы ад членства. Дзвінскае таварystва раварыстаў у 1912 г. налічвала 26 чал., віленскае – каля 160, гімнастычнае таварystва «Сокал» у Мінску – амаль 150 [6, с. 186]. Бюджэты спартыўных таварystваў у разглядаемы час складаліся з трох крыніц: капіталаўкладанні ўладальнікаў і заснавальнікаў (узгадаем Чапскага ці Любанскага), членскія ўзносы і сродкі, атрыманыя ад дадатковай дзейнасці таварystваў. Прычым з кожным годам прапорцыя мянялася на карысць дадатковай дзейнасці: чыталі лекцыі, праводзілі спаборніцтвы з продажам квіткоў, здавалі ў арэнду свае аб'екты (на гомельскім трэку нават праводзілі тэатральныя пастаноўкі) [12, с. 1]. Да пачатку Першай сусветнай вайны ў беларускіх губернях па падліках аўтара ўзнікла больш 40 спартыўных таварystваў (у тым ліку арганізацыі па садзейнічанні фізічнаму развіццю).

Рост нацыянальных рухаў у Еўропе у пачатку XX ст. прымусіў улады больш пільна сачыць за грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку і спартыўнымі. Перапіска віленскага генерал-губернатара з падначаленымі сведчыць аб падазроных адносінах да ўсялякіх арганізацый: «Не подлежит сомнению, что в последнее время одним из средств революционного воспитания масс крайние партии избрали создание возможно большего числа союзов и обществ, с тем, чтобы, объединяя в их среде трудовой городской класс, всецело подчинить их своему влиянию» [13, с. 20].

Асабліва гэта датычылася польскіх і літоўскіх таварystваў. Так, пасля даравання палітычных свабодаў падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. масава рэгіструюцца спартыўныя арганізацыі «Сокал». Гэта быў працэс або легалізацыі наяўных аб'яднанняў, або стварэнне новых. Мінскае аддзяленне спартыўна-гімнастычнага таварystва «Сокал» адкрылася вясной 1907 г., змяшчалася яно ў доме № 31 па Губернатарскай. Называлі яго часам «польскім», але вызначэнне гэта было абывацельскім-павярхоўным. У адным з рапартаў мінскі паліцмайстар выказаў меркаванне з нагоды гімнастычных практыкаванняў, што былі арганізаваны членамі таварystва «Сокал» у садзе Якубовіча. Ён лічыў, што такім чынам палякі практыкуюць зварот са зброяй і займаюцца падрыхтоўкай антырасейскага паўстання [8, арк. 2–14].

Пасля спаду рэвалюцыйнага руху пачынае наладжвацца супрацоўніцтва паміж спартыўнымі таварыствамі і гарадскімі ўладамі. Першыя былі зацікаўлены ў пашырэнні інфраструктуры і выкананні статутных мэт, а мясцовыя ўлады разлічвалі на прыбытак і павышэнне свайго аўтарытэту сярод выбаршчыкаў. Частай з'явай было членства ў таварыствах прадстаўнікоў гарадской думы. Сярод членаў Мінскага таварыства аматараў спорта былі Ян Караль і Георгій (Ежы) Чапскія, Я. Любанскі, С. Хржанстоўскі і інш. Барон М. А. Рэбіндэр лабіраваў атрыманне зямлі для трэка ў Віцебску ў гарадской управе: «Просим содействовать в предоставлении в распоряжение Общества участка городской земли около 25 сажен длины и около 10 сажен ширины для возведения на этом участке здания велодрома… желательно, чтобы велодром находился недалеко от путей трамвая» [14, арк. 1]. Дзяржава небеспадстаўна бачыла ў спорце спосаб пераключэння грамадскай актыўнасці з рэвалюцыйнай працы, адцягнення моладзі ад палітыкі і выцяснення апазіцыйнага руху з губернскіх школ. Гомельская грамадскасць на старонках мясцовай газеты «Гомельская копейка» абмяркоўвала неабходнасць стварэння рачного яхт-клуба для жыхароў горада [15, с. 4].

*Заключэнне.* Спартыўныя грамадскія арганізацыі ў беларускіх губернях прайшлі характэрныя для Расійскай імперыі этапы станаўлення, аднак са значным спазненнем. Гэта было выклікана больш павольнымі працэсамі мадэрнізацыі і марудным станаўленнем гарадской культуры. Слабасць сярэдняга класу і абмежаванні з боку ўлады замаруджвалі працэс узнікнення спартыўных таварыстваў. На першым этапе да 1907 г. большасць спартыўных арганізацый захоўвала пераважна элітарны характар, аднак з 1907–1909 гг. пачынаецца пашырэнне сацыяльнай базы гэтых таварыстваў і павелічэнне папулярнасці масавых відаў – футбола, канькоў, лёгкай і цяжкай атлетыкі. Тым не менш, да пачатку Першай сусветнай вайны тут дзейнічала больш за 40 таварыстваў (яхт-клубы, таварыствы аматараў спорту і фізічнага развіцця, шахматныя гурткі, гімнастычныя і цяжкаатлетычныя суполкі).

*Літаратура і крыніцы*


1. *Туманова, А. С.* Общественные организации в России: правовое положение. 1860–1930-е гг. : монография / А. С. Туманова. – М. : Проспект, 2019. – 480 с.
2. *Суник, А. Б.* Российский спорт и олимпийское движение на рубеже XIX–XX веков / А. Б. Суник. – М. : Советский спорт, 2004. – 764 с.
3. *Степанский, А. Д.* История общественных организаций дореволюционной России / А. Д. Степанский. – М. : МГИАИ, 1979. – 80 с.
4. Устав Витебского общества Велосипедистов-любителей. – Витебск : губ. типо-литография, 1899. – 23 с.
5. *Черепица, В. Н.* Звенья единой цепи: Большие и малые события в истории Гродненщины XIX – XX столетий : монография / В. Н. Черепица. – Гродно : ГрГУ, 2009. – 518 с.
6. *Шыбека, З. В.* Мінск сто гадоў таму / З. В. Шыбека. – Мінск : Беларусь, 2007. – 304 с.
7. *Хмельницкая, И. Б.* Спортивные общества и досуг в столичном городе начала XX века. Петербург и Москва / И. Б. Хмельницкая. – М. : Новый хронограф, 2011. – 336 с.
8. Переписка с Минским губернатором и Минским губернским жандармским управлением об открытии, утверждении устава и характере деятельности польского спортивно-гимнастического общества «Сокол» // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НІАБ). – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 1–16.
9. Циркуляр губернатора об учреждении общества физического развития и спорта и устав общества // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НІАБ). – Ф. 2496. Воп. 1. Спр. 1700. Арк. 1–12.
10. *Полторацкий, А.* Старым варяжским путем / А. Полторацкий. – СПб. : тип. М. М. Стасюлевича, 1903. – 121 с.
11. *Воронич, Т.* Общественные инициативы жителей Витебска на рубеже XIX–XX вв. / Т. Воронич // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зб. навук. арт. Гродз. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2007. – С. 279–285.
12. Большой театр на треке // Гомельская копейка. – 1911. – 13 июня. – № 3. – С. 1.
13. О зарегистрированных обществах и союзах в пределах Северо-Западного края на основании правил 4 марта 1906 г. // Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). – Ф. 378. Воп. 114. Спр. 169. Арк. 12–46.
14. Об отводе обществу велосипедистов-любителей под постройку участка городской земли в 3-й части г. Витебска на Ковальской площади // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НІАБ). – Ф. 2496. Воп. 1. Спр. 1672. Арк. 1–3.
15. *Миляев, А. С.* О речном яхт-клубе / А. С. Миляев // Гомельская копейка. – 1911. – 15 июня. – № 4. – С. 3.


*References*


1. *Tumanova, A. S.* Obshchestvennye organizacii v Rossii: pravovoe polozhenie. 1860–1930-e gg. : monografiya / A. S. Tumanova. – M. : Prospekt, 2019. – 480 s.
2. *Sunik, A. B.* Rossijskij sport i olimpijskoe dvizhenie na rubezhe XIX–XX vekov / A. B. Sunik. – M. : Sovetskij sport, 2004. – 764 s.
3. *Stepanskij, A. D.* Istoriya obshchestvennyh organizacij dorevolyucionnoj Rossii / A. D. Stepanskij. – M. : MGIAI, 1979. – 80 s.
4. Ustav Vitebskogo obshchestva Velosipedistov-lyubitelej. – Vitebsk : gub. tipo-litografiya, 1899. – 23 s.
5. *Cherepica, V. N.* Zven'ya edinoj cepi: Bol'shie i malye sobytiya v istorii Grodnenshchiny HIH – HH stoletij : monografiya / V. N. Cherepica. – Grodno : GrGU, 2009. – 518 s.
6. *Shybeka, Z. V.* Minsk sto gadoǔ tamu / Z. V. Shybeka. – Minsk : Belarus', 2007. – 304 s.
7. *Hmel'nickaya, I. B.* Sportivnye obshchestva i dosug v stolichnom gorode nachala HH veka. Peterburg i Moskva / I. B. Hmel'nickaya. – M. : Novyj hronograf, 2011. – 336 s.
8. Perepiska s Minskim gubernatorom i Minskim gubernskim zhandarmskim upravleniem ob otkrytii, utverzhdenii ustava i haraktere deyatel'nosti pol'skogo sportivno-gimnasticheskogo obshchestva «Sokol» // Nacyyanal'ny gistarychny arhiǔ Belarusi (NIAB). – F. 306. Vop. 1. Spr. 19. Ark. 1–16.
9. Cirkulyar gubernatora ob uchrezhdenii obshchestva fizicheskogo razvitiya i sporta i ustav obshchestva // Nacyyanal'ny gistarychny arhiǔ Belarusi (NIAB). – F. 2496. Vop. 1. Spr. 1700. Ark. 1–12.
10. *Poltorackij, A.* Starym varyazhskim putem / A. Poltorackij. – SPb. : tip. M. M. Stasyulevicha, 1903. – 121 s.
11. *Voronich, T.* Obshchestvennye iniciativy zhitelej Vitebska na rubezhe XIX–XX vv. / T. Voronich // Garady Belarusi ǔ kantekscе palityki, ekanomiki, kul'tury : zb. navuk. art. Grodz. dzyarzh. un-t ; redkal.: I. P. Kren', I. V. Sorkina (adk. red.) [i insh.]. – Grodna : GrDU, 2007. – S. 279–285.
12. Bol'shoj teatr na treke // Gomel'skaya kopejka. – 1911. – 13 iyunya. – № 3. – S. 1.
13. O zaregistrirovannyh obshchestvah i soyuzah v predelah Severo-Zapadnogo kraya na osnovanii pravil 4 marta 1906 g. // Litoǔski dzyarzhaǔny gistarychny arhiǔ (LDGA). – F. 378. Vop. 114. Spr. 169. Ark. 12–46.
14. Ob otvode obshchestvu velosipedistov-lyubitelej pod postrojku uchastka gorodskoj zemli v 3-j chasti g. Vitebska na Koval'skoj ploshchadi // Nacyyanal'ny gistarychny arhiǔ Belarusi (NIAB). – F. 2496. Vop. 1. Spr. 1672. Ark. 1–3.
15. *Milyaev, A. S.* O rechnom yaht-klube / A. S. Milyaev // Gomel'skaya kopejka. – 1911. – 15 iyunya. – № 4. – S. 3.